Как активное развитие новых информационных технологий и перевод книжных изданий в цифровую форму повлияет на всю культуру, сформировавшуюся именно как культура книжная, основанная на функционировании книги Гуттенберга? Возможно, поэтому проблема книжной культуры в информационном обществе пока остается актуальной и это обстоятельство делает ее осмысление и обсуждение значимым и своевременным.

На ваш форум собрались известные ученые – историки, книговеды, философы, культурологи, научные сотрудники библиотек, музеев, отделов редких книг не только из Беларуси, но и из России, Литвы, Польши, Словакии и других стран, объединенные единым стремлением показать какое место занимает книга вообще и белорусская книга в частности в мировой книжной культуре.

Разрешите пожелать плодотворной работы вашей конференции, творческих идей, новых проектов и открытий, полезных дискуссий, интересных встреч.

# "КНІЖНІЦА" БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ

Кніжніцай даўней называлі кнігазбор, кніжную калекцыю, бібліятэку… Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў (АРК) Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў (БДУКМ) – гэта не толькі складовая частка бібліятэкі, якая пачала фармавацца ў 1975 г., але і своеасаблівы кніжны асяродак, дзе студэнты спасцігаюць значэнне кніжнай спадчыны і пераемнасці яе традыцый, знаёмяцца з сусветнай і беларускай кніжнай культурай. Нездарма колішнія выкладчыкі і супрацоўнікі Мінскага інстытута культуры (МІК) Я.С.Умецкая, Н.М.Цацуліна, В.І.Захарава, Р.С.Зяневіч займаліся карпатлівым зборам рэдкіх кніг, адшукваючы іх у абменных фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (тады – Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У.І.Леніна), Прэзідэнцкай бібліятэкі (тады – Урадавая), бібліятэкі Мінскага педагагічнага інстытута, бібліятэкі Мінскага абласнога камітэта КПБ і інш., сярод якіх былі старадрукі XVIII ст., рэдкія выданні XIX – сярэдзіны XX ст. па розных галінах ведаў, у іх ліку, з аўтографамі і экслібрысамі. Разнастайным па змесце быў сабраны імі фонд прыжыццёвых выданняў (М.Карамзін, М.Дабралюбаў, А.Астроўскі, М.Салтыкоў-Шчадрын, В.Крылоў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Л.Талстой, А.Чэхаў, А.Талстой, С.Ясенін, М.Горкі, А.Дадэ, А.Франс, М.Твэн, Дж.Лондан, Ж.Верн, Т.Ман і інш.), айчынных гістарычных крыніц ("Акты" Віленскай Археаграфічнай камісіі, "Гісторыка-юрыдычныя матэрыялы" Віцебскага цэнтральнага архіва старажытных актаў і інш.). Шэраг выданняў уяўлялі з сябе выдатныя помнікі кніжнага мастацтва, асабліва вылучаліся кнігі, апраўленыя ў спецыяльныя бібліяфільскія пераплёты, з характэрнымі рысамі тыпаграфскай вытворчасці таго ці іншага перыяду, што дазваляла скласці яскравае ўяўленне аб эвалюцыі друкаванай кнігі. Першыя рэктары МІК Алесь Петрашкевіч і Нічыпар Пашкевіч марылі стварыць для сваіх студэнтаў музей кнігі...

Аднак толькі на пачатку 1990-х гадоў, калі ў грамадстве пачаўся працэс пераасэнсавання сістэмы каштоўнасцяў, узрасла цікавасць і да кнігі мінулых часоў як да помніка матэрыяльнай, мастацкай і духоўнай культуры. Па-новаму была ўспрынята і ідэя стварэння аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў у бібліятэцы МІК, якую падтрымалі рэктар Ядвіга Грыгаровіч, старэйшыя прафесары Мікола Грынчык, Гурый Барышаў. Яны аднымі з першых ахвяравалі для будучага аддзела рарытэтныя зберажэнні з сваіх прыватных кнігазбораў. Адбылося своеасаблівае вяртанне забытых на пэўны час рэдкіх кніг бібліятэкі, якія маглі паслужыць важкімі крыніцамі для выкладчыкаў і студэнтаў, абмежаваных за савецкім часам у доступе да адпаведных матэрыялаў. 16 сакавіка 1993 г. Вучоная рада МІК замацавала рашэнне аб арганізацыі аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў, а 4 кастрычніка 1995 г. адбылася ўжо яго прэзентацыя, на якой шырокай грамадскасці быў прадстаўлены новы асяродак кніжнай культуры (гэтая дата лічыцца днём нараджэння аддзела).

Асноўнай місіяй АРК стаў збор, захаванне, вывучэнне і папулярызацыя помнікаў кніжнай культуры як носьбітаў матэрыяльных, мастацкіх і духоўных каштоўнасцяў беларускага народа і чалавецтва ўвогуле. Кніга – захавальніца вечных ісцін, першасных сэнсавых матрыц культуры, ведаў мінулага, ментальнасці людзей розных эпох і сацыякультурных асяродкаў – у гэтым яе крыніцазнаўчае значэнне для развіцця сучаснай навукі і культуры, духоўнага выхавання асобы. Такое асэнсаванне значэння кнігі пакладзена ва ўсе напрамкі шматграннай дзейнасці АРК.

У адпаведнасці з крытэрыямі рэдкасці (храналагічным, мастацкага і паліграфічнага афармлення, унікальнасці), пакладзенымі ў аснову профіля камплектавання АРК, ідзе фармаванне фонду аддзела: 1) рукапісы і рукапісныя кнігі старажытнай традыцыі на беларускай і іншых мовах незалежна ад часу стварэння; 2) архіўныя матэрыялы: рукапісы дзеячаў культуры і мастацтва Беларусі (прыярытэт маюць супрацоўнікі БДУКМ); 3) старадрукі (да 1825 г.), у іх ліку кнігі кірылічнага і глагалічнага друку (незалежна ад часу выдання); 4) выданні рэдкія і каштоўныя па іншых адзнаках (да 1945 г.), у іх ліку і выданні, якія вызначаюцца высокім паліграфічным мастацтвам незалежна ад году выдання, традыцыйныя бібліяфільскія рэдкасці, асобнікі з пра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вененцыямі, факсімільныя і рэпрынтныя выданні старадрукаў і рэдкіх кніг, выданні незвычайных фарматаў і форм, мініяцюрныя выданні; 5) каштоўныя тэматычна падабраныя калекцыі друкаваных матэрыялаў, гістарычныя калекцыянерскія комплексы, калекцыі вядомых дзеячаў культуры БДУКМ; 6) друкаваны ліставы, выяўленчы матэрыял (арыгінальныя фотаздымкі тэматычна звязаныя з дзейнасцю выдатных дзеячаў культуры і мастацтва Беларусі, у прыватнасці, прафесараў і выкладчыкаў БДУКМ; экслібрысы); 7) фонд даведачнай і навуковай літаратуры па гісторыка-кнігазнаўчым комплексе.

Значным набыткам на пачатку адкрыцця АРК сталі такія старадрукі, як "Мінея Службовая" (Масква, 1622); "Жыція Святых" Пятра Скаргі (Вільня: Каралеўская друкарня пры акадэміі, 1774; 1780), "Псалтыр" (Гродна: Каралеўская друкарня, 1788); "Школьныя размовы" (Масква, 1785) і інш. За час існавання фонд АРК, які першапачаткова складаў каля 5 тысяч назваў кніг, актыўна папаўняўся ахвяраваннямі з прыватных збораў. Каштоўныя і рэдкія выданні падаравалі ў АРК А.І.Мальдзіс, Г.В.Штыхаў, В.У.Скалабан, В.Ф.Шматаў, А.В.Сабалеўскі, Н.С.Гілевіч, мітрапаліт Філарэт (Вахрамееў), Я.Д.Грыгаровіч, В.Е.Лявончыкаў, Я.С.Умецкая, Н.М.Цацуліна, Ю.А.Лабынцаў (Расія), Ю.Туронак (Польшча), Георг і Віктар Ельскія (Францыя; Украіна), В.Кіпель і Н.Рос (ЗША) і інш. Наладжваліся міжнародныя сувязі па кнігаабмену з Нацыянальнай бібліятэкай у Варшаве, Беларускай Бібліятэкай і Музеем імя Ф.Скарыны ў Лондане, Навуковай бібліятэкай Вільнюскага універсітэта, Бібліятэкай Кангрэса ЗША, Нямецкім інфармацыйным цэнтрам абмену і іншымі.

Асаблівы гонар аддзела – кніжныя калекцыі прафесараў БДУКМ доктара філалагічных навук М.М. Грынчыка (больш за 1500 экз.) і доктара мастацтвазнаўства Г.І. Барышава (каля 250 экз.). У апошні час фонд папоўніўся калекцыямі з прыватных кнігазбораў такіх знакамітых беларусаў, як Сяргей Грахоўскі (больш за 800 экз.), Янка Брыль (каля 250 экз.), Анжэй Цеханавецкі (каля 200 экз.). У АРК перададзены рукапісныя фонды з прыватных архіваў Я.С.Умецкай (Ф.1), М.М.Грынчыка (Ф.2), С.В.Ашаровіча (Ф.3), Ельскіх (Ф.4), у складзе якіх знаходзяцца тысячы каштоўных крыніцазнаўчых матэрыялаў па гісторыі і культуры, кніжнай і бібліятэчнай справе Беларусі. З 2005 г. пачата фармаванне калекцыі фотадакументаў па гісторыі універсітэта, якая ўжо складае каля 10000 адзінак захоўвання. Наперадзе праца па стварэнні электроннай поўнатэкставай калекцыі фотаздымкаў з шматаспектным апісаннем кожнага аб'екта па такіх параметрах, як месца, падзея, сюжэт, персаналія і д.п.

Адным з аб'ектаў захоўвання ў АРК з'яўляюцца кнігі з правененцыямі: экслібрысамі, пячаткамі, аўтографамі і д.п., якія раскрываюць шырокую геаграфію і няпростую "біяграфію" кніжных выданняў – ад манастырскіх бібліятэк да дзяржаўных, ад прыватных да грамадскіх; з Расіі, Літвы, Кіргізіі, Германіі, Польшчы, ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, Італіі, Аргентыны і інш. У АРК ёсць кнігі нават з адзнакамі знакамітай бібліятэкі Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў, Рускай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тургенеўскай бібліятэкі ў Парыжы. Адным з ранніх аўтографаў, напрыклад, з’яўляецца запіс Аляксандра II у дзень смерці яго бацькі цара Мікалая I (1855 г.). Сярод дарчых надпісаў дзяржаўных асоб сучаснасці – аўтограф Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Г. Лукашэнкі на яго першым выданні “Городецкие уроки” (Мн., 1990), пакінутым пры наведванні БДУКМ. Больш за 350 аўтографаў вядомых беларускіх пісьменнікаў У.Караткевіча, А.Лойкі, А.Адамовіча, С.Александровіча, Р.Барадуліна, Я.Брыля, Н.Гілевіча, В.Зуёнка, М.Калачынскага, Г.Каханоўскага, Г.Кісялёва, А.Ліса, М.Лужаніна, А.Мальдзіса, А.Сыса, І.Чыгрына, Ф.Янкоўскага і інш. налічваецца ў адным толькі зборы М.М.Грынчыка.

У адпаведнасці з профілем камплектавання АРК пачата праца па стварэнні электроннага каталога “Рэдкая кніга”, мэтавае прызначэнне якога заключаецца ў раскрыцці складу фонда, дапамога чытачам у пошуку і выбары рэдкай і старадрукаванай кнігі. Акрамя традыцыйнага даведачна-бібліяграфічнага апарату на фонд АРК (алфавітнага і сістэматычнага каталога, картатэк “Кніжная справа. Кнігазнаўства”, “Перыядычныя выданні”) супрацоўнікі аддзела вядуць тэматычныя электронныя базы даных “Кнігазнаўства” (тэматыка – кнігазнаўства, усеагульная гісторыя кнігі, гісторыя кнігі ў Беларусі, друк, выдавецкая справа, паліграфічная дзейнасць, кніжны гандаль, кнігазборы, мастацтва кнігі, рэдкая кніга); “Гуманістыка” (тэматыка – гісторыя, этналогія, філасофія, гісторыя архітэктуры і мастацтва, гісторыя рэлігіі, паліталогія, сацыялогія, дэмаграфія, гісторыя літаратуры, мовазнаўства); “Хрысціянства” (тэматыка – гісторыя і сучасны стан хрысціянства ў Беларусі, праваслаўе, каталіцызм, уніяцтва, літаратура пра жыццё і дзейнасць мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі) незалежна ад наяўнасці крыніц у фондзе бібліятэкі БДУКМ.

Непарыўная повязь сучаснасці з мінулым адлюстравалася і ў працы АРК па выяўленні кніжных рарытэтаў аднаго з адметнейшых гістарычных кнігазбораў Беларусі XIX – пачатку XX ст., які належаў пісьменніку, краязнаўцу і кнігазнаўцу Аляксандру Ельскаму. Вынікам стала распачатая электронная рэканструкцыя яго прыватнай бібліятэкі ў выглядзе аб’ектна-графічнага каталога “Драбніцы Ельскіяны”, які быў прадстаўлены на арганізаванай і праведзенай супрацоўнікамі АРК у 1999 г. міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Універсітэты Ельскіх (да 165-годдзя з дня нараджэння А.Ельскага)”. У зборніку матэрыялаў канферэнцыі, які атрымаў назву “Дзеля блізкіх і прышласці” (Мн., 1999), упершыню ў асобным выданні былі сабраны дакументы, працы, фотаздымкі і ілюстрацыі, якія адлюстроўваюць гісторыю рода Ельскіх, іх уклад у беларускую і еўрапейскую культуру. “165-годдзе з дня нараджэння аднаго з самых вядомых Ельскіх – Аляксандра стала адначасова працягам і пачаткам працы навуковага даследавання не толькі знакамітага на Беларусі і Польшчы роду, але і амаль не распрацаванага пласта сядзібнай культуры, якая паўстае своеасаблівым феноменам у гісторыка-куль-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

турным развіцці беларускага грамадства" (ЛіМ. 1999. 17 вер. С.15). Асноўны акцэнт канферэнцыі быў зроблены на вылучэнні кніжнай культуры Беларусі як адной з важнейшых складаючых сядзібнай культуры. "Універсітэты Ельскіх" актуалізавалі праблему вывучэння прыватных кнігазбораў Беларусі, якая застаецца слаба распрацаванай, а тым не менш, такія калекцыі фармуюць грамадскую і гістарычную спадчыну першачарговага парадку, што робіць магчымым перадачу будучым пакаленням слядоў дзейнасці пэўных асоб, і тым самым з'яўляецца важкім інструментам ў справе захавання калектыўнай памяці. У гэтым кірунку праводзілася праца і па складанні каталога кніжнай выставы з прыватных збораў "Рукапісныя і друкаваныя кнігі беларускіх татараў" (Да 600-годдзя татарскага асадніцтва на Беларусі)" (Мн., 1997). Каштоўным дапаўненнем у каталогу з'яўляюцца ілюстрацыі тэкстаў і вадзяных знакаў, якія сустракаюцца ў рукапісах XVIII – XIX стст. Да 80-годдзя з дня нараджэння доктара філалагічных навук, колішняга загадчыка кафедры беларускай літаратуры М.М. Грынчыка былі арганізаваны і праведзены навуковыя чытанні "Грынчыкавымі сцежкамі" (19 лістапада 2003 г.), складзены каталог "Усё сваё – дарагое" (Мн., 2005), які адлюстраваў рэдкія кнігі XIX – XX стст. і кнігі з аўтографамі; выйшла тэлеперадача з удзелам супрацоўнікаў АРК "Святло далёкай зоркі" (14 красавіка 2005 г.). І ўсё гэта стала магчымым дзякуючы кніжнай калекцыі і архіўным дакументам М.М.Грынчыка ў АРК – першакрыніцы інфармацыі аб жыцці і дзейнасці яе ўладальніка.

Важнае значэнне ў АРК надаецца раскрыццю навуковай спадчыны вучоных БДУКМ шляхам падрыхтоўкі бібліяграфічных паказальнікаў. Па ініцыятыве супрацоўнікаў аддзела ў 1993 г. створана і выдаецца серыя біябібліяграфічных паказальнікаў "Дзеячы навукі і культуры Беларусі". Выйшлі 7 выпускаў, якія прысвечаны навуковай дзейнасці прафесараў БДУКМ М.М.Грынчыка, А.П.Грыцкевіча, Г.І.Барышава, В.Е.Лявончыкава, Ю.М.Чурко, Л.А.Дзямешкі, А.І.Смоліка. Акрамя гэтага, у 2005 г. выйшаў з друку бібліяграфічны паказальнік "Працы выкладчыкаў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў (1994–2004)", які стаў працягам, надрукаванага ў 1994 г. бібліяграфічнага паказальніка "Працы выкладчыкаў факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм Беларускага універсітэта культуры (1944–1994)".

Калектыў АРК стаў пачынальнікам духоўнага асветніцтва ў галіне навукова-бібліяграфічнай дзейнасці ў Беларусі. Першым у гэтым напрамку стаў выдадзены грунтоўны персанальны даведнік да 60-годдзя з дня нараджэння Мітрапаліта Філарэта (Вахрамеева) (Мн., 1997). Арыгінальнасць методыкі бібліяграфавання, выкарыстанай пры падрыхтоўцы даведніка, была адзначана ў шматлікіх водгуках, у тым ліку супрацоўнікаў славянскага аддзела Нью-Йоркскай публічнай бібліятэкі (ЗША), бібліятэкі Тэалагічнага інстытута Лундскага універсітэта (Швецыя) і інш. Беларускія спецыялісты лічаць гэты

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

даведнік "самай значнай з'явай персанальнай бібліяграфіі ў сацыягуманітарнай сферы", аналагаў якому няма не толькі ў Беларусі, але і ў замежных краінах (Паказальнік бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі, 2000. Мн., 2001. С.11). Даведнік актыўна выкарыстоўваецца ў вучэбным працэсе пры падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў. У гэтай жа серыі выйшаў паказальнік твораў і літаратуры аб жыцці і дзейнасці за 1615–2001 г. беларускага асветніка Лявонція Карповіча (Мн., 2002). На XI Мінскіх Епархіяльных чытаннях, прысвечаных 1000-годдзю Тураўскай епархіі (2005 г.) адбылася прэзентацыя падрыхтаванага да друку навукова-бібліяграфічнага даведніка, прысвечанага свяціцелю Кірылу, епіскапу Тураўскаму, у якім знайшло адлюстраванне больш за 1000 крыніц і публікацый. З імёнамі супрацоўнікаў АРК звязаны і пачатак серыі бібліяграфічных паказальнікаў у дапамогу духоўнаму асветніцтву, першы з якіх выйшаў у 2002 г. ("Читающему Священное Писание").

Адным з кірункаў працы АРК у студэнцкім асяроддзі з'яўляецца гуманістычна-культурнае асветніцтва, у аснове якога – комплексны падыход да папулярызацыі кніжнай спадчыны Беларусі праз выставы, прагляды, прэзентацыі, сябрыны, экскурсіі, гутаркі і г.д. Найбольш адметныя з праведзеных мерапрыемстваў: "На хвалях успамінаў" – сябрына-прэзентацыя выданняў "Філарэты і філаматы" (Мн., 1998), "Раса нябёсаў на зямлі тутэйшай" (Мн., 1998), прысвечаная 200-годдзю А.Міцкевіча; "Воля на крыжы" – прэзентацыя кнігі А.Петрашкевіча (2001); "Всемирны: песни и страдание, и с терниeм лавровый венок" – прэзентацыя кнігі Дж.Байрана "Дон Жуан. Прароцтва Дантэ" ў перакладзе на беларускую мову У.Скарынкіна (Мн., 2004); "Тры вымярэнні Сяргея Грахоўскага" – прэзентацыя кніжнай калекцыі, падараванай АРК (2004); кніжныя каляды "У гасцях у вечнасці" – прэзентацыя серыі "Сем цудаў Беларусі" з удзелам А.Бутэвіча і П.Татарнікава (2006) і інш., у якіх, зразумела, асноўнае месца займалі ўнікальныя выданні як сучасныя, так і мінулых часоў.

Фонд АРК, яго інфармацыйны і навуковы патэнцыял дазваляе вызначыць перспектыву стварэння на базе аддзела пэўнай вучэбнай мадэлі рэдкага фонда. Ужо на сёняшні дзень ідзе яго актыўнае выкарыстанне ў распрацоўцы такіх вучэбных дысцыплін факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый, як "Гісторыя беларускай кнігі", "Бібліятэказнаўства. Гісторыя", "Кнігазнаўства" і інш.

Супрацоўнікі АРК займаюцца распрацоўкай тэарэтычных і прыкладных даследаванняў кніжнай культуры Беларусі, як важнейшай складаючай духоўнага і культурнага рэсурсу грамадства. Тэматыка даследаванняў ахоплівае праблемы вывучэння гісторыі і сучаснага стану кнігавыдання ў Беларусі, беларускіх гістарычных кнігазбораў, распрацоўкі ў галіне бібліятыпалогіі, новых методык апісання для стварэння электронных рэсурсаў і навуковага бібліяграфавання старадрукаў. Супрацоўнікі АРК з'яўляюцца аўтарамі каля 200 публікацый. У 2005 г. Л.І.Доўнар была абаронена дысертацыя на ступень кандыдата педагагічных навук па тэме "Развіццё кнігавыдавецкай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасці ў Мінску (1795–1917 гг.): кнігазнаўчы аспект". У гэтым жа годзе апублікавана манаграфія Т.А.Самайлюк "Православная книга в Беларуси" (Мн., 2005), прысвечаная праблемам сучаснага праваслаўнага выдання, а таксама ёю падрыхтавана да абароны кандыдацкая дысертацыя па тэме "Рэлігійная кніга на Беларусі ў XVIII ст.".

АРК з самага пачатку свайго існавання быў зацікаўлены ў культываванні беларускага кнігазнаўства, беларускай кніжнай культуры праз арганізацыю міжнародных навуковых канферэнцый. Яшчэ ў 1996 г. была арганізавана і праведзена першая міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі: гісторыя і сучаснасць" (Мн., 1997), атрымаўшая шырокі рэзананс у сродках масавай інфармацыі. Так, у "ЛіМе" за 1996 г. ад 11 кастрычніка адзначалася, што "ўпершыню на абсягах былога СССР абмяркоўвалася пытанне недзяржаўнай выдавецкай дзейнасці і яе ўзаемадзеяння з бібліятэкамі рэспублікі". І, сапраўды, недзяржаўная выдавецкая дзейнасць як новая з'ява была вылучана з кантэксту і тэндэнцый кнігавыдання Беларусі і зафіксавана ў рамках праведзенай канферэнцыі.

Штогод, пачынаючы з 1997 г., супрацоўнікі аддзела арганізоўваюць у БДУКМ Міжнародныя навуковыя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры, якія пацвярджаюць неабходнасць асэнсавання хрысціянскай кніжнай спадчыны, стаўшай асновай фармавання асветніцтва, навукі і культуры Беларусі; сведчыць аб тым, што галоўным крытэрыем ў культуры быў і застаецца ўзровень яе духоўнасці і адказнасці, яе маральны змест. Па ініцыятыве АРК і па благаславенні мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі з 1998 г. чытанні праводзяцца сумесна з Інстытутам тэалогіі імя свв. Мяфодзія і Кірылы БДУ. У рамках чытанняў калектыў АРК арганізуе навукова-практычную канферэнцыю на тэму "Духоўнае адраджэнне грамадства і праваслаўная кніга". Па выніках чытанняў і канферэнцый выйшла 8 зборнікаў.

Адным з вынікаў навукова-даследчай работы за дзесяцігадовы перыяд дзейнасці АРК з'явілася арганізаваная 7–8 лютага 2006 г. міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры", мэтай якой была кансалідацыя спецыялістаў розных галін навукі і практыкі для абмеркавання актуальных праблем даследаванняў тэорыі і метадалогіі беларускай кніжнай культуры, яе дыялектыкі, гісторыі, працэсаў сучаснай вытворчасці і "спажывання" нацыянальнай кнігі, а таксама стварэння навукова-інфармацый прасторы і адукацыйнага асяроддзя, якія садзейнічалі б развіццю і захаванню кніжнай культуры ў Беларусі.

У 2006 г. АРК прыступіў да рэалізацыі комплекснага навукова-даследчага праекта "Кніжная культура Беларусі: гісторыка-тэарэтычны аспект" (зарэгістраваны ў БелІСА), актуальнасць якога звязана з захаваннем нацянальнай ідэнтычнасці і беларускай кніжнай культуры ў імклівым працэсе глабалізацыі інфармацыйнай прасторы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На сучасным этапе вядзецца падрыхтоўка слоўніка тэрмінаў, бібліяграфічнага паказальніка і вучэбнага дапаможніка па гісторыі кнігі Беларусі, якія маюць на мэце запаўненне прагалаў у дадзенай галіне навукі і адукацыі.

У заключэнні... “Кніжніца” БДУКМ – аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў у складзе Тамары Андрэеўны Самайлюк (заг. аддзела), Ларысы Іосіфаўны Доўнар (гал. бібліятэкар), Дзіны Цімафееўны Лявончыкавай (гал. бібліятэкар), Таццяны Аркадзьеўны Дзем’яновіч (вядучы бібліятэкар) – выказвае ўсім калегам і сябрам вялікую ўдзячнасць за ўзаемаразуменне, падтрымку і супрацоўніцтва, якое, спадзяемся, прадоўжыцца і будзе толькі мацавацца дзеля зберажэння і памнажэння кніжнай спадчыны Беларусі.

*Складальнікі*




*Экслібрыс аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў*
*бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта*
*культуры і мастацтваў*
*Мастак Уладзімір Васюк*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## АСНОЎНЫЯ НАВУКОВЫЯ І БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ ПРАЦЫ СУПРАЦОЎНІКАЎ АРК

**Недзяржаўная** выдавецкая дзейнасць у Беларусі: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 3–4 кастр. 1996 г.) / БУК. – Мн., 1997. – 72 с.

**Кірыла-Мяфодзіеўскія** навуковыя чытанні, прысвечаныя Міжнароднаму дню славянскага пісьменства і культуры : матэрыялы чытанняў (Мінск, 23 мая 1997 г.) / БУК. – Мн., 1998. – 199 с.

**Дзеля** блізкіх і прышласці : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. "Універсітэты Ельскіх" (да 165-годдзя з дня нарадж. А. Ельскага), Мінск, 7 кастр. 1999 г. / БУК. – Мн., 1999. – 156 с. : іл.

**Доўнар Л.І.** Развіццё кнігавыдавецкай дзейнасці ў Мінску (1795–1917) : кнігазнаўчы аспект : аўтарэф. дыс. … канд. пед. навук : 05.25.03 / Доўнар Л.І. – Мн., 2005. – 21 с.

**Самойлюк Т.А.** Православная книга в Беларуси / Т.А. Самойлюк. – Мн. : Православ. Братство в честь Святого Архистратига Михаила, 2005. – 128 с.

**Мікалай Міхайлавіч Грынчык** : (Да 70-годдзя з дня нараджэння) : бібліягр. паказ. / БУК ; склад. Т.А. Самайлюк, рэд. І.П. Кажура. – Мн., 1993. – 35 с. – (Дзеячы навукі і культуры Беларусі).

**Анатоль Пятровіч Грыцкевіч** : бібліягр. паказ. / БУК ; склад. Т.А.Самайлюк ; рэд. І.П.Кажура. – Мн., 1994. – 77 с. – (Дзеячы навукі і культуры Беларусі).

**Рукапісныя** і друкаваныя кнігі беларускіх татараў : каталог выставы : (да 600-годдзя татарскага асаднiцтва на Беларусі) / уклад. Л.Доўнар, Т.Самайлюк, Т.Дзем`яновіч. – Мн., 1997. – 22 с.

**Митрополит Филарет** (Вахромеев). К 60-летию со дня рождения : биобиблиогр. справочник / МЕУ ; сост. Т.А.Самойлюк, Т.А.Демьянович. А.М.Летко, И.В.Мельник. – Мн., 1997. – 292 с.

**Гурый Іларыёнавіч Барышаў** : бібліягр. паказ. / БУК ; склад. Т.А. Дзем`яновіч, Л.І. Доўнар, І.П. Кажура ; рэд. Т.А. Самайлюк ; прадм. Л.Ф. Голікава. – Мн., 1998. – 80 с. – (Дзеячы навукі і культуры Беларусі).

**Юлія Міхайлаўна Чурко** : бібліягр. паказ. / БУК ; склад. Т.А.Дзем`яновіч, Л.І.Доўнар, Д.Ц.Лявончыкава, Т.А.Самайлюк ; прадм. А.Ладыгінай. – Мн., 1998. – 54 с. – (Дзеячы навукі і культуры Беларусі).

**Васіль Емельянавіч Лявончыкаў** : бібліягр. паказ. / БУК ; склад. Т.А.Дзем`яновіч, Л.І.Доўнар, Т.А.Самайлюк ; прадм. В.А.Факеева. – Мн., 1998. – 34 с. – (Дзеячы навукі і культуры Беларусі).

**Лілія Адамаўна Дзямешка** : бібліягр. паказ. / БУК ; склад. Т.А. Дзем`яновіч, Л.І. Доўнар, І.П. Кажура ; рэд. Т.А. Самайлюк ; прадм. В.Е. Лявончыкава. – Мн., 1998. – 31 с. – (Дзеячы навукі і культуры Беларусі).

**Bibliografia** Białoruska, 1992–1994 / L. Downar, T. Dziemianowicz, T. Samojluk. – Warszawa : Przegląd Wschodni, 2002. – 240 s. – (Bibliografia Europy Wshodniej / Studium Europy Wschodniej Uniwersytetu Warszawskiego ; т. 13).

**Аляксандр Іванавіч Смолік** : бібліягр. паказ. / БДУ культуры і мастацтваў ; склад. І.П. Кажура, Т.А. Самайлюк, І.А. Дрожжынава.– Мн., 2005.– 38 с.– (Дзеячы навукі і культуры Беларусі ; [вып. 8]).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ